# ВЫБІРАЙ ЛЮБУЮ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ!

*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, мясцкома, камітэта ЛКСМБ і прафкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

№ 22 (453) Серада, 5 ліпеня 1961 г. Цана 1 кап.



Новы корпус Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ул. І. Леніна.

## Спецвыпуск, прысвечаны новаму набору ў БДУ

## *Хутка ўніверсітэту—40 год*

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт створан у 1921 годзе ў адпаведнасці з дэкрэтам, паднісаным Уладзімірам Ільічом Леніным. У кастрычніку 1961 года яму споўніцца 40 год.

Адкрыццё ўніверсітэта—першай вышэйшай навучальнай установы ў рэспубліцы—упершыню прадставіла магчымасць беларускаму народу рыхтаваць высокакваліфікаваныя нацыянальныя кадры для дзяржаўнай, гаспадарчай і культурнай дзейнасці.

У цяперашні час Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт з'яўляецца буйнейшай навучальнай установай Беларускай ССР. Тут падрыхтавана звыш 16 тысяч спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі, вялікая колькасць работнікаў для вышэйшых навучальных і навуковых устаноў. Многія выпускнікі ўніверсітэта ў пасляваенны час паспяхова абаранілі дысертацыі і ў цяперашні час працуюць у інстытутах Акадэміі навук, на адказных дзяржаўных, партыйных і гаспадарчых пасадах.

Рашэннямі XXI з'езда КПСС і чэрвеньскага Пленума ЦК КПСС прадугледжана карэнная перабудова ўсёй прамысловасці на новай тэхнічнай аснове. У сувязі з гэтым у бліжэйшыя гады рэспублікі будзе патрэбна вялікая колькасць спецыялістаў для раду новых галін навукі і тэхнікі: радыётэхнікі, радыёэлектронікі, ядзернай фізікі, атамнай і малекулярнай спектраскапіі, вылічальнай матэматыкі і электроннай тэхнікі, хіміі палімераў і хіміі вуглевадародаў, біяхіміі, біяфізікі, фотасінтэза, мікрабіялогіі і інш.

У 1961 годзе ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт будзе значна павялічаны прыём на стацыянарнае і вячэрняе навучанне па спецыяльнасцях фізічнага, матэматычнага, хімічнага і біялагічнага цыклаў.

Вялікае значэнне надаецца практычнай падрыхтоўцы студэнтаў шляхам іх працы ў заводскіх лабараторыях, канструктарскіх бюро, на доследных сельскагаспадарчых станцыях і ў іншых навукова-даследчых установах. Для асоб, якія пасля заканчэння ўніверсітэта пойдуць на работу ў сярэднюю школу, значна павялічана педагагічная практыка ў школе.

У мэтах паляпшэння практычнай падрыхтоўкі прадугледжана стажыроўка студэнтаў на рабочых месцах на вытворчасці па спецыяльнасці.

Такім чынам, практычныя заняткі, вучэбная і вытворчая практыка з'яўляюцца разам з лекцыямі асновай авалодання студэнтамі ўсім комплексам навук па данай спецыяльнасці.

У цяперашні час на 9 факультэтах Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна вучыцца звыш 6 тысяч студэнтаў. Усю вучэбную і навуковую работу ажыццяўляюць 48 кафедр, на якіх працуе звыш 350 прафесараў, дацэнтаў, асістэнтаў. Універсітэт мае дзве вучэбна-навуковыя станцыі: Нарачанскую біялагічную і біёлага-геаграфічную станцыю ў Чырвоным Урочышчы,

Універсітэт мае добра абсталяваныя музеі: гісторыка-археалагічны, мінералагічны і заалагічны, 35 кабінетаў, 50 лабараторый. Кніжны фонд бібліятэкі налічвае больш паўмільёна тамоў.

Калектыў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна, паспяхова ажыццяўляючы гістарычныя рашэнні XXI з'езда КПСС, з велізарным энтузіязмам рыхтуецца да маючага адбыцца XXII з'езда КПСС. Гэты працоўны ўздым з'яўляецца сведчаннем таго, што ўніверсітэт з гонарам выканае пастаўленыя перад ім задачы і зробіць вялікі ўклад у агульную справу ўсяго савецкага народа — разгорнутае будаўніцтва камуністычнага грамадства.

Універсітэт прадстаўляе шырокую магчымасць вучыцца без адрыву ад вытворчасці. У БДУ імя У. І. Леніна маецца 7 аддзяленняў завочнага факультэта: юрыдычнае, рускай мовы і літаратуры, беларускай мовы і літаратуры, журналістыкі, матэматычнае, біялагічнае, геаграфічнае.

Лабараторна-экзаменацыйныя сесіі ў завочнікаў праходзяць 2 разы ў год: зімой і летам.

## ТУТ РЫХТУЮЦЬ ХІМІКАЎ

МОЖНА прама сказаць, што ні адна навука так глыбока не пусціла карэнні ва ўсе галіны народнай гаспадаркі, як хімія. Развіццё хіміі садзейнічае развіццю фізікі, біялогіі, медыцыны, геалогіі, біяхіміі, геахіміі.

Вялікія перспектывы развіцця хімічнай прамысловасці, а ў сувязі з гэтым і хімічнай навукі, адкрыліся і ў нашай рэспубліцы. Беларусь ператвараецца ў краіну вялікай хіміі. Рэканструюцца і значна расшыраюцца Магілёўская фабрыка штучнага валакна, Мінскі завод медыцынскіх прэпаратаў, Бабруйскі гідролізны завод, прадпрыемствы па вырабу розных гатункаў шкла, шырокага асартыменту прадуктаў лесахіміі. Адкрыццё ў Старобінскім раёне залежаў каліiйных соляў дало магчымасць стварыць базу для вырабу каліiйных угнаенняў на ўноў пабудаваным Салігорскім каліiйным камбінаце, адным з буйнейшых у Еўропе. Тут жа адначасова будзе здабывацца спажыўная соль.

У старажытным Полацку хутка заканчваецца будаўніцтва другога буйнейшага прамысловага аб'екта сямі−годкі—нафтаперапрацоўчага камбіната. Яго прадукцыя забяспечыць вадкім палівам і змазачнымі матэрыяламі не толькі нашу рэспубліку, але і рад абласцей суседніх саюзных рэспублік. У Гродна будуецца магутны азотна-тукавы камбінат, у Шацілках—другая фабрыка штучнага валакна.

Вялікае і шматбаковае прымяненне хіміі ў народнай гаспадарцы, велічныя перспектывы яе развіцця адкрываюць перад моладдзю, абраўшай спецыяльнасць хіміка, вялікія магчымасці ў творчай дзейнасці на карысць Радзімы.



*У аналітычнай лабараторыі хімфака ідуць заняткі.*

Хімічны факультэт універсітэта рыхтуе на трывалай фізіка-матэматычнай аснове высокакваліфікаваныя кадры шырокага профілю для работы ў навукова-даследчых установах, ВНУ, вытворчых лабараторыях, у якасці выкладчыкаў сярэдніх школ. На працягу навучання значная частка студэнтаў, аб'яднаных у студэнцкае навуковае таварыства, удзельнічае ў рабоце навуковых гурткоў. Лепшыя студэнты рэкамендуюцца ў аспірантуру, дзе рыхтуюцца кадры навуковых работнікаў.

Падрыхтоўка спецыялістаў вядзецца па неарганічнай, арганічнай, фізічнай, калоіднай і аналітычнай хіміі. Вучэбны працэс ажыццяўляецца 5-ю кафедрамі факультэта, якія ўзначальваюцца буйнымі вучонымі рэспублікі: акадэмікамі АН БССР, прафесарамі Н. Ф. Ярмоленкам, Б. В. Ерафеевым, М. М. Паўлючэнкам, прафесарамі Ф. Г. Асіпенкам, Г. Л. Старобінцам.

У перспектыве намячаецца значны рост і пашырэнне факультэта, будуць адкрыты новыя кафедры і створан рад навукова-даследчых лабараторый.

**І. Г. ЦІШЧАНКА,**
**дэкан хімічнага факультэта.**

## Навука будучага

Фізічны факультэт з'яўляецца адным з самых вялікіх, растучых факультэтаў універсітэта, ён мае дзённае і вячэрняе аддзяленні. Тут рыхтуюцца высокакваліфікаваныя спецыялісты-фізікі для самых разнастайных галін народнай гаспадаркі рэспублікі. Выпускнікі факультэта працуюць у навукова-даследчых лабараторыях заводаў, інстытутах АН БССР, у вылічальных цэнтрах, на выкладчыцкай рабоце ў ВНУ, тэхнікумах і сярэдніх школах.

Вучэбная, навукова-даследчая і выхаваўчая работа на факультэце вядзецца сям'ю кафедрамі, якія ўзначальваюцца віднейшымі вучонымі, работы якіх вядомы далёка за межамі БССР. Так, напрыклад, аптычнымі кафедрамі загадваюць лаўрэат Сталінскай прэміі прафесар Б. І. Сцяпанаў і доктар фізіка-матэматычных навук прафесар А. Н. Сеўчанка. Толькі за сем апошніх год гэтымі кафедрамі падрыхтавана каля 200 спецыялістаў, многія з якіх паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі і маюць па 10—12 друкаваных работ. Трэба адзначыць, што навуковай работай яны пачалі займацца яшчэ студэнтамі.

Развіццю творчых здольнасцей і самастойнасці ў навукова-даследчай рабоце студэнтам каштоўную дапамогу аказваюць заняткі ў лабараторыях, аснашчаных вялікай колькасцю сучаснага абсталявання. Кіраўніцтва гэтымі заняткамі, як і іншымі відамі работы ажыццяўляецца прафесарамі і дацэнтамі. Сярод іх неабходна адзначыць праф. М. А. Ельяшэвіча, якому двойчы прысуджвалася Сталінская прэмія.

Вялікую работу па падрыхтоўцы спецыялістаў у галіне радыёфізікі і электронікі, а таксама фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў праводзяць кафедры эксперыментальнай фізікі, электрафізікі, фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў. Пад кіраўніцтвам прафесара І. Г. Некрашэвіча (кафедра эксперыментальнай і агульнай фізікі) на працягу некалькіх год паспяхова ажыццяўляюцца даследаванні ў галіне эмісіі рэчыва з электродаў, а таксама са сценак сасуда, затрымліваючага гарачую плазму. Выключнае значэнне гэтыя даследаванні набываюць у сувязі з пошукамі плазменных тэрмаэлементаў. Другі напрамак навуковай работы кафедры звязан з вывучэннем электронных працэсаў металаў у кантакце з паўправаднікамі.

Пад кіраўніцтвам акадэміка АН БССР прафесара Н. Н. Сірата на кафедры фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў вядуцца даследаванні па вывучэнню новых кампазіцый ферытаў, маючых вялікае значэнне для радыётэхнічнай прамысловасці, для электронна-рашаючых машын, магнітных, узмацняльнікаў, бескантактных элементаў, аўтаматычных канструкцый.



*Студэнты фізічнага факультэта ў аптычнай лабараторыі праводзяць доследы.*

На кафедры тэарэтычнай фізікі і механікі, якой загадвае праф. Ф. І. Фёдараў, вядуцца даследаванні ў галіне квантавай фізікі поля (тэорыя элементарных часцінак) і статыстычнай фізікі.

У лютым 1961 года пачала працаваць новая кафедра ядзернай фізікі і прымянення атамнай энергіі ў мірных мэтах.

Калектыў фізічнага факультэта будзе рады прыняць у свае рады моладзь, якая палюбіла фізіку і выказала жаданне спецыялізавацца ў навуцы, маючай у наш час выключнае значэнне.

**М. П. ХАЛІМАНОВІЧ,**
**дэкан фізічнага факультэта, дацэнт.**

## Матэматычны факультэт

*Не так даўно на базе былога фізіка-матэматычнага факультэта створаны два новыя факультэты: фізічны і матэматычны. Цяпер матэматычны факультэт адзін з буйнейшых і вядучых ва ўніверсітэце. На факультэце праводзіцца вялікая навукова-даследчая работа ў галіне метадаў вылічэнняў, аналітычнай тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў, канструктыўнай тэорыі функцый, тэорыі груп і дыферэнцыяльнай геаметрыі. На факультэце працуюць прафесары Н. П. Яругін, В. І. Крылоў, Д. А. Супруненка, А. В. Іваноў, А. Х. Турэцкі.*

*Матэматычны факультэт рыхтуе спецыялістаў для навуковых устаноў, вылічальных цэнтраў, вышэйшай і сярэдняй школы. Навуковую работу на факультэце вядуць 5 кафедр і вылічальны цэнтр. Найбольш актуальныя студэнцкія работы друкуюцца ў навуковых часопісах.*

*Нашай краіне неабходны спецыялісты-матэматыкі, выдатна валодаючыя сваёй творчай і цікавай навукай. Задача падрыхтоўкі найбольш кваліфікаваных спецыялістаў-матэматыкаў у нашай рэспубліцы рашаецца матэматычным факультэтам універсітэта.*



*У мінералагічным музеі ўніверсітэта.*

# Філалагічны факультэт

Філалагічны факультэт БДУ імя У. І. Леніна складаецца з трох аддзяленняў: беларускай мовы і літаратуры, рускай мовы і літаратуры, журналістыкі. На факультэце вучацца больш 700 студэнтаў. Існуюць вячэрнія аддзяленні: журналістыкі, рускай і беларускай мовы і літаратуры. У 1961/1962 навучальным годзе на стацыянар філфака, уключаючы і вячэрнія аддзяленні, будзе залічана 175 студэнтаў, а на аддзяленні завочнага факультэта—175 студэнтаў.

На факультэце працуе 6 кафедр, якія аб'ядноўваюць лепшыя навуковыя сілы рэспублікі ў галіне мовазнаўства, літаратуразнаўства і журналістыкі. Лекцыі, практычныя заняткі чытаюцца прафесарамі і дацэнтамі, а таксама выкладчыкамі высокай кваліфікацыі. Вялікая ўвага звяртаецца на самастойную навукова-даследчую работу студэнтаў. Пры кафедрах арганізаваны і працуюць 10 навуковых студэнцкіх гурткоў.

Факультэт рыхтуе высокакваліфікаваных філолагаў і журналістаў. Значнае месца ў вучэбным плане аддзялення журналістыкі займаюць спецыяльныя дысцыпліны—гісторыя рускай і беларускай журналістыкі, гісторыя партыйна-савецкага друку, яго тэорыя і практыка, друк замежных кампартый, практычная стылістыка рускай і беларускай мовы і інш.

У новых вучэбных планах факультэта, складзеных на аснове Закона аб умацаванні сувязі школы з жыццём і далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў нашай краіне, вялікае месца адводзіцца вытворчай практыцы як студэнтаў-філолагаў (у школах), так і студэнтаў-журналістаў (у рэдакцыях газет). Тэрмін вытворчай практыкі для студэнтаў-журналістаў павялічваецца з 16 да 24 тыдняў, а для філолагаў—з 6 да 20 тыдняў. Аддзяленне журналістыкі сіламі студэнтаў выпускае вучэбную газету «Журналіст», у якой студэнты набываюць навыкі газетнай работы.

Вялікая ўвага звяртаецца на разгортванне мастацкай самадзейнасці, фізкультурнай работы.

**М. Р. ЛАРЧАНКА,**
**дэкан філалагічнага факультэта, прафесар, доктар філалагічных навук.**

# ВЕЛЬМІ ВАЖНАЯ І ЦІКАВАЯ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ

*Распрацоўваючы актуальныя праблемы біялагічнай навукі, калектыў прафесарска-выкладчыцкага саставу біялагічнага факультэта рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў для работы ў навукова-даследчых лабараторыях, вышэйшых навуковых установах і сярэдніх школах. У адпаведнасці з новымі вучэбнымі планамі на сямі кафедрах факультэта спецыялісты падрыхтоўваюцца па важнейшых галінах біялогіі: генетыкі і селекцыі, фізіялогіі раслін, мікрабіялогіі і вірусалогіі, фізіялогіі чалавека і жывёл, заалогіі пазванковых і беспазванковых.*

*Вучэбная і навуковая работа на факультэце вядзецца не толькі ў галіне вывучэння агульнабіялагічных пытанняў, але і ў напрамку аказання навуковай дапамогі сельскай гаспадарцы. Распрацоўваюцца таксама навуковыя асновы вядзення рыбнай гаспадаркі, пытанні, звязаныя з медыцынскай практыкай і іншыя.*

*Вучэбна-выхаваўчая і навуковая работа на факультэце ажыццяўляецца пад кіраўніцтвам буйных вучоных, прафесараў*



Вучні 3-га класа 14-й школы г. Мінска прышлі на экскурсію ў заалагічны музей універсітэта.

*Т. Н. Годнева, Н. В. Турбіна, Н. А. Дарожкіна, Г. Г. Вінберга, Б. Я. Эльберта, П. Ф. Ракіцкага, Г. С. Юньева, І. Н. Сяржаніна, Л. С. Чаркасавай і іншых. Пад іх кіраўніцтвам за пасляваенныя гады каля 50 выпускнікоў факультэта абаранілі кандыдацкія дысертацыі.*

*Акрамя вывучэння агульнаадукацыйных і спецыяльных дысцыплін студэнты праходзяць вучэбную і вытворчую пактыку на біялагічных станцыях факультэта і ў лабараторыях доследных станцый, у навукова-даследчых інстытутах, у запаведніку «Белавежская пушча», на Беламорскай біялагічнай станцыі, у навуковых установах Паўднёвай паласы СССР.*

**П. Г. ПЯТРОВІЧ,**
**дэкан біялагічнага факультэта.**

# ГІСТАРЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

Гістарычны факультэт адыгрывае вялікую ролю ў падрыхтоўцы навуковых і педагагічных кадраў для развіцця асветы, культуры і гістарычнай навукі Савецкай Беларусі. За параўнаўча кароткі тэрмін свайго існавання факультэт падрыхтаваў звыш 1300 спецыялістаў-гісторыкаў. Выпускнікі факультэта працуюць у сярэдніх школах, у навукова-даследчых установах, ВНУ, музеях, архівах, партыйных, камсамольскіх і савецкіх органах.Толькі ў пасляваенны перыяд больш 50 выпускнікоў факультэта закончылі аспірантуру, абаранілі кандыдацкія дысертацыі і паспяхова працуюць у ВНУ рэспублікі, інстытуце гісторыі АН БССР, інстытуце гісторыі КПБ і іншых навуковых установах.

З 1959/1960 навучальнага года гістарычны факультэт працуе па новаму вучэбнаму плану, распрацаванаму на аснове Закона аб умацаванні сувязі школы з жыццём і далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі. На аснове гэтага вучэбнага плана факультэт рыхтуе настаўнікаў гісторыі і канстытуцыі для сярэдніх школ і навуковых работнікаў — археолагаў, этнографаў, музеезнаўцаў і архівазнаўцаў.

Асобы, якія залічаны на факультэт адразу пасля заканчэння сярэдняй школы, першы год навучання займаюцца завочна і працуюць у вытворчасці з пераходам з 2-га курса на стацыянарнае навучанне.

Лекцыі, семінарскія і практычныя заняткі для студэнтаў факультэта чытаюць і праводзяць высокакваліфікаваныя спецыялісты—прафесары, дацэнты і выкладчыкі. На факультэце працуюць прафесар І. Н. Лушчыцкі, П. Ф. Пратасеня, В. І. Сцяпанаў, Н. П. Палеціка, Г. М. Ліўшыц і іншыя. Для самастойнай работы студэнтаў маюцца тры кабінеты: гісторыі СССР, гісторыі БССР і ўсеагульнай гісторыі, гісторыка-археалагічны музей. У кабінетах праводзяцца кансультацыі, дэманструюцца вучэбныя і навукова-папулярныя фільмы, студэнты атрымліваюць вучэбную і навуковую літаратуру, наглядныя дапаможнікі, бібліяграфічныя даведкі.

За пяцігадовы тэрмін навучання студэнты факультэта праходзяць розныя віды практыкі: педагагічную ў школах, піянерскую ў піянерскіх лагерах, археалагічную і этнаграфічную ў навуковых экспедыцыях, музейную, архіўную і бібліяграфічную ў музеях, архівах і бібліятэках.

Вучэбную і навукова-даследчую работу і вытворчую практыку на факультэце арганізуюць і праводзяць спецыяльныя кафедры: гісторыі СССР, гісторыі БССР, новай гісторыі, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў.

**П. З. САВАЧКІН,**
**дэкан гістарычнага факультэта.**

# ГЕАГРАФІЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

Геаграфія належыць да ліку старажытнейшых навук аб Зямлі. Галоўная задача геаграфіі—пазнаць геаграфічнае асяроддзе, прыродныя багацці, умовы для гаспадарчай дзейнасці чалавека ў розных зонах і раёнах Зямлі. З другога боку, геаграфія раскрывае гістарычныя прычыны і аб'ектыўныя заканамернасці размяшчэння і спалучэння насельніцтва і гаспадаркі.

План эканамічнага развіцця нашай краіны прадугледжвае ўсё большае выкарыстанне прыродных рэсурсаў у народнай гаспадарцы. Кожная саюзная рэспубліка развівае перш за ўсё тыя віды гаспадаркі, для якіх маюцца найбольш спрыяльныя ўмовы на яе тэрыторыі. У той час улічваюцца інтарэсы ўсёй нашай вялікай сацыялістычнай краіны.

З году ў год узрастае роля кваліфікаваных спецыялістаў у галіне геаграфіі; яны патрэбны не толькі ў школах, а і ў розных даследчых, праектна-пошукавых і плануючых установах.

На геаграфічным факультэце маюцца чатыры кафедры: фізічнай геаграфіі СССР і замежных краін, эканамічнай геаграфіі, глебазнаўства і геалогіі. Факультэт мае добра абсталяваныя кабінеты, геалагічны музей, геаграфічную станцыю. Кафедры маюць у сваім распараджэнні разнастайныя вучэбныя дапаможнікі.

Для правядзення палявых геаграфічных даследаванняў у розныя раёны рэспублікі, а таксама на Каўказ, Паволжжа, штогод снаражаюцца комплексныя навуковыя экспедыцыі.

Студэнты I курса вывучаюць агульнаадукацыйныя і геаграфічныя дысцыпліны. Развіццё сучаснай геаграфіі немагчыма без меры і ліку, без укаранення ў метады геаграфічных даследаванняў колькасных характарыстык. Таму студэнты вывучаюць таксама вышэйшую матэматыку, фізіку і хімію. На 2 курсе студэнты слухаюць спецыяльныя курсы, якія вызначаюць іх спецыялізацыю.

На 3 курсе адбываецца раздзяленне студэнтаў па спецыяльнасці фізічнай і эканамічнай геаграфіі. На наступных курсах вывучаецца геаграфія нашай краіны, замежных краін, гісторыя і праблемы геаграфіі, агульнаадукацыйныя прадметы.

Вялікае значэнне ў падрыхтоўцы географаў мае вучэбная, вытворчая і педагагічная практыка. Ёй удзяляецца каля адной трэці ўсяго вучэбнага часу.

**І. І. ТРУХАН,**
**дэкан геаграфічнага факультэта, дацэнт.**

# ФІЗІЧНАЕ ВЫХАВАННЕ ВА ЎНІВЕРСІТЭЦЕ

Спартыўны калектыў універсітэта з'яўляецца адным з вядучых у рэспубліцы. Ва ўніверсітэце арганізаваны секцыі па 21 віду спорта, у якіх займаецца звыш 800 студэнтаў. Найбольш масавыя секцыі: легкай атлетыкі, спартыўнай гімнастыкі, валейбола, баскетбола, лыжнага спорту і іншыя.

Заняткі ў секцыях праводзяць больш 30 высокакваліфікаваных спецыялістаў фізічнага выхавання з вялікім повытам выкладчыцкай і трэнерскай работы.

Многія студэнты ўніверсітэта за перыяд вучобы дабіліся высокіх спартыўных вынікаў. Студэнт хімічнага факультэта майстар спорту В. Гараеў на 16 Алімпійскіх гульнях у Рыме заваяваў сярэбраны медаль па трайных скачках у даўжыню. Добрымі спартсменамі з'яўляюцца студэнтка філфака М. Верамейчык, студэнт гістфака Н. Базылеў, студэнт хімфака Е. Емельянаў, студэнт юрфака В. Шаверын і многія іншыя. Дзевятнаццаць студэнтаў універсітэта ўваходзяць у склад зборных каманд БССР і 37 чалавек—у зборныя каманды ДСТ «Буравеснік». Штогод ў розных спартыўных секцыях універсітэта падрыхтоўваецца каля 500 спартсменаў-разраднікаў.

Кожны год ва ўніверсітэце праводзіцца спартакіяда па 18 відах спорту і агляд-конкурс на лепшую пастаноўку фізкультурнай работы сярод факультэтаў.

Нашы зборныя каманды па розных відах спорту штогод прымаюць удзел у спаборніцтвах на першынство ВНУ рэспублікі. Найбольшага поспеху ў 1960/61 навучальным годзе дабіліся нашы зборныя каманды па лёгкай атлетыцы, плаванню і цяжкай атлетыцы. Перамогшы ўсе астатнія зборныя каманды ВНУ, акрамя каманды ІФК, яны заваявалі права абараняць гонар рэспублікі на 7-й спартакіядзе прафсаюзаў у Маскве.

Вялікай папулярнасцю сярод студэнтаў універсітэта карыстаецца турызм. Многія студэнты праводзяць свае канікулы ў цікавых турысцкіх паходах па роднаму краю. Толькі ў 1961 годзе ў час зімовых канікулаў звыш 150 чалавек зрабілі паходы па розных раёнах Беларусі. Многія студэнты, займаючыся ў секцыях турызма, робяць падарожжы па Карпатах, Каўказу і Карэліі. Амаль кожны выхадны дзень наладжваюцца паходы ў раён станцыі «Зялёнае» і другія прыгарадныя месцы. Займаюцца турызмам звыш 200 студэнтаў.

У маляўнічым месцы на возеры Нарач кожны год каля 300 чалавек могуць правесці свой летні адпачынак. У перыяд знаходжання ў аздараўленча-спартыўным лагеры студэнты вучацца плаваць, павышаюць свае спартыўнае майстэрства, умацоўваюць здароўе. Яны аказваюць дапамогу суседнім калгасам у час уборачных работ.

Звыш 2600 студэнтаў з'яўляюцца членамі спартыўнага клуба універсітэта, якому ў 1960 годзе за высокія паказчыкі ў спартыўна-масавай рабоце было прысвоена званне лепшага калектыву. Калектыў быў узнагароджан Вялікім памятным сярэбраным медалем і граматай Цэнтральнага Савета студэнцкага добраахвотнага спартыўнага таварыства «Буравеснік».

**В. П. ШЭПЕЛЕВІЧ,**
**загадчык кафедры фізічнага выхавання і спорту.**



НА ЗДЫМКУ: момант сустрэчы паміж баскетбалістамі хімфака і юрфака.

Ва ўніверсітэце працуюць вячэрнія аддзяленні матэматычнага, хімічнага, біялагічнага, фізічнага, геаграфічнага, юрыдычнага, гістарычнага факультэтаў, рускай мовы і літаратуры, беларускай мовы і літаратуры, журналістыкі філалагічнага факультэта.

У гэтым годзе на вячэрнія аддзяленні будзе прынята 325 чалавек.

# ЮРЫДЫЧНЫ ФАКУЛЬТЭТ

Юрыдычны факультэт рыхтуе маладых спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі для работы ў судзе, пракуратуры, адвакатуры, органах дзяржаўнага кіравання і інш.

На факультэце працуе 26 выкладчыкаў, а таксама работнікі розных савецкіх устаноў, запрошаныя на пагадзіннае выкладанне. Факультэт мае тры кафедры: тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, грамадзянскага права і працэсу, крымінальнага права і працэсу. Ёсць чатыры вучэбныя кабінеты, крыміналістычная лабараторыя, вялікая бібліятэка.

Вучэбны план юрыдычнага факультэта прадугледжвае вывучэнне ўсіх адгалінаванняў савецкага сацыялістычнага права: крымінальнага права і працэсу, грамадзянскага права і працэсу, працоўнага і сямейнага, зямельнага і калгаснага, дзяржаўнага і адміністрацыйнага, фінансавага права і інш. Вялікае значэнне надаецца вывучэнню крыміналістыкі, арганізацыі суда і пракуратуры, судовай статыстыкі, бухгалтарскага ўліку і судова-бухгалтарскай экспертызы, судовай медыцыны і судовай псіхіятрыі.

Студэнты юрыдычнага факультэта праходзяць практыку ў судах, пракуратуры, Саветах, выканкомах. На 4-ым курсе праводзіцца стажыроўка ў тых органах, куды выпускнік будзе накіраваны на работу пасля сканчэння ўніверсітэта.

Юрыдычны факультэт рыхтуе не толькі юрыстаў высокай кваліфікацыі і шырокага профілю, а і людзей, якія акажуць дзейсную дапамогу савецкім органам, грамадскасці ў іх барацьбе з парушэннямі законнасці і парадку.

**В. А. ДАРОГІН,**
**дэкан юрыдычнага факультэта.**

**Нам. рэдактара Р. ПЛАТОНАЎ.**

НАШ АДРАС:
**Мінск, Універсітэцкі гарадок, біякорпус, 31. Тэлефон: 2-07-19.**

Друкарня выдавецтва МВСС і ПА БССР.

АТ 06481. Зак. 1474.